# НавінЫ
БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"

нумар 10 (27) кастрычнік 2000 г.

# МАРШ СВАБОДЫ

## У трэцім Маршы Свабоды ўдзельнічала 15 тысячаў чалавек




***Марш Свабоды - 3, які прайшоў у Менску, сабраў каля 15 тысячаў чалавек – столькі ж, колькі й першы Марш Свабоды ў 1999 г. Менчукі і тыя, хто адмыслова прыехаў у сталіцу, каб паўдзельнічаць у Маршы, выступілі за свабодныя й справядлівыя выбары, супраць фарсу, прызначанага Лукашэнкам на 15 кастрычніка.***

А 12-й гадзіне ўдзельнікі Маршу сабраліся на пляцоўцы ля Нацыянальнай Акадэміі Навук, адкуль сьвяточная калёна рушыла праезнай часткай праспэкту Скарыны й вуліцы Сурганава да пл. Бангалор. Арганізатары відавочна праводзілі паралелі з сэрбскімі падзеямі: гэта было відно нават у самім правядзеньні Маршу. Калёна выглядала паэўрапейску: безьліч бел–чырвона–белых сьцягоў, сьцягі эўрапейскіх краінаў, людзі з барабанамі й сьвісткамі, балёнікамі ў руках, лёзунгі, расьцяжкі з назвамі арганізацыяў. Актыўна выкарыстоўваліся й моманты пэрфомансу: маладафронтаўцы несьлі драўляную будку з надпісам "выбіральня" й прапаноўвалі ўсім ахвочым "прагаласаваць", укінуўшы ў выбіральню "бюлетэнь" – кавалак туалетнай паперы.

На пл. Бангалор прайшоў кароткі мітынг, на якім выступілі Юры Хадыка, Станіслаў Шушкевіч, Вінцук Вячорка, Анатоль Лябедзька, Павал Севярынец, Аляксей Кароль, Людміла Гразнова й Валеры Шчукін.

Вітаньне ўдзельнікам Маршу Свабоды даслаў зь Вільні Старшыня Вярхоўнага Савету Рэспублікі Беларусь Сямён Шарэцкі: "Вітаю вас на Маршы Свабоды! Разумею, што на яго вас вывела вашае сумленьне й заклапочанасьць лёсам Радзімы, якая сёньня стогне пад ботам прарасейскага, па сутнасьці, акупацыйнага для беларускага народу, дыктатарскага рэжыму. Але ніякая сіла ня здолее перамагчы свабодалюбства й імкненьне нашага народу да Волі й Незалежнасьці".

Падчас мітынгу ў неба на надзіманых балёніках ўзьляцеў вялікі бел-

працяг на стар. 2

vytoki.net

Пачатак на стар. 1

# МАРШ СВАБОДЫ

чырвона-белы сьцяг.

Трэці Марш прайшоў спакойна, амаль без эксцэсаў. Аднак, затрыманьні ўсё ж–такі былі. Былі затрыманыя сп.сп. Мазгавы й Мацкойць, прычым апошняга затрымалі не на самім Маршы, а на станцыі мэтро Інстытут культуры – толькі за тое, што ён ішоў у байцы "Марш Свабоды". Спадара Мацкойця пратрымалі тры гадзіны ў пастарунку, пасьля чаго былі вымушаныя адпусьціць. Таксама быў затрыманы й непаўнагадовы Аляксей Андросаў, якога адвезьлі ў Савецкі РАУС. З РАУСу Аляксея ў той жа дзень забраў ягоны бацька. А перад пачаткам Маршу, на скрыжаваньні вуліцаў Акадэмічнай і Сурганава, міліцыянты заблякавалі сяброў Рыцарскага клюбу, якія мусілі ўдзельнічаць у тэатралізаваным прадстаўленьні, едучы на конях. Коней трымалі ў блякадзе тры гадзіны, пакуль ня скончылася акцыя.



*Мітынг скончыўся ўрачыстым падняцьцём бел–чырвона–белага сьцяга*

Нагадаем, што падчас першага Маршу Свабоды, які прайшоў 17 кастрычніка 1999 году, уладам удалося справакаваць жорсткія сутычкі паміж удзельнікамі акцыі й сіламі рэжыму. Тады на некалькіх чалавек (у т.л. маладых Германа Сушкевіча, Анатоля Лазарава, Глеба Догіля ды Андрэя Валабуева) улады завялі крымінальныя справы. Пад пагрозай крымінальнага перасьледу хлопцы зьехалі зь Беларусі і каля паўгоду жывуць у суседняй Польшчы. Сёньня хлопцы зьвярнуліся да арганізатараў Маршу з заклікам паўзьдзейнічаць на беларускія ўлады, каб тыя спынілі крымінальны перасьлед маладых людзей, кожнаму зь якіх пагражае на радзіме ад 1 да 5 гадоў турмы за ўдзел у Маршы Свабоды 17 кастрычніка 1999 г.

Напрыканцы мітынгу ўдзельнікі Маршу прынялі кароткую рэзалюцыю:

Мы, удзельнікі Маршу Свабоды:

– Пацьвярджаем невыкананьне ўмоваў дэмакратычных выбараў;

– Заклікаем усіх людзей Беларусі ня ўдзельнічаць у выбарчым фарсе, які за народныя грошы ставіць Лукашэнка, каб захаваць сваю ўладу;

– Папярэджваем аматараў "інтэграцыяў" і "саюзных дзяржаваў" у Маскве й Менску, што мы будзем бараніць незалежнасьць нашай краіны ўсімі сродкамі.

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**

# Прэсавая канфэрэнцыя па выніках "Маршу Свабоды"

***У панядзелак, 2 кастрычніка, у памяшканьні Ўправы БНФ адбылася прэсавая канфэрэнцыя, прысьвечаная вынікам Маршу Свабоды - 3, праведзенага ў рамках кампаніі "Байкот - 2000".***

Канфэрэнцыю праводзілі старшыня БНФ Вінцук Вячорка, старшыня АГП Анатоль Лябедзька, Віктар Івашкевіч (Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў), Аляксей Кароль - намесьнік старшыні БСДП(НГ) і Алесь Бяляцкі -- кіраўнік Праваабарончага цэнтру "Вясна".

Арганізатары далі станоўчую ацэнку Маршу Свабоды. Марш прайшоў мірна, нягледзячы на тое, што некалькі разоў міліцыя спрабавала абвастрыць сытуацыю. Акцыя вызначылася сваёй відовішчнасьцю; як зазначыў Вінцук Вячорка, у гэтым пляне трэці Марш Свабоды быў найлепшым мітынгам. Было заўважана, што далучыліся новыя людзі, – і гэта гаворыць аб павелічэньні цікавасьці да акцыяў апазыцыі. Сп. Віктар Івашкевіч заўважыў, што "Марш Свабоды" ў пэўным сэнсе ёсьць пачаткам перадвыбарчай агітацыі перад прэзыдэнцкімі выбарамі.

Задачай трэцяга Маршу арганізатары вызначылі пераадольваньне страху ў грамадстве. Марш Свабоды – 3 разглядаецца як перадача эстафэты рэгіёнам Беларусі. Таму 8 кастрычніка плянуецца правядзеньне сінхронна ў 23 беларускіх гарадах сваіх "Маршаў Свабоды". Вінцук Вячорка зазначыў, што трэба браць урок у Сэрбскай апазыцыі, якая працуе ў рэгіёнах. Як сказаў Анатоль Лябедзька, "калі не падымем рэгіёны, складана разьлічваць на перамогу."

Галоўнымі лёзунгамі "Маршу Свабоды" былі заклікі да байкатаваньня выбараў. Таму праваабаронцы цэнтар "Вясна" даў інфармацыю пра затрыманьні, якія адбыліся да 28 верасьня , і былі зьвязаныя з акцыяй "Байкот - 2000": 16 затрыманых, якія былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасьці, 32 грамадзяніна, на якіх складзеныя пратаколы адміністрацыйнага затрыманьня й чакаецца суд, 17 грамадзянаў затрымалі, але не складалі пратакола аміністрацыйнага затрыманьня.

Перад пачаткам "Маршу Свабоды -- 3"супрацоўнікі ДАІ затрымалі некалькі машынаў з гукаўзмацняльнай апаратурай, хаця праз 15-20 хвілінаў машыны вымушаныя былі адпусьціць.

Аб'яднаная апазыцыя мяркуе правесьці чарговае масавае шэсьце ў Менску 14 кастычніка. Адпаведная заяўка пададзеная ў гарвыканкам. Шэсьце адбудзецца ў 15 гадзінаў, пачнеца ля Акадэміі Навук і мусіць скончыцца на пляцы Незалежнасьці. На "Маршах Свабоды", якія адбудуцца ў рэгіёнах, будуць гучаць заклікі да ўдзелу ў менскім шэсьці 14-га кастрычніка.

**Алёна ПАПЛАЎСКАЯ**

# БАЙКОТ — 2000

***МЕНСК***

На скрыжаваньні праспэкту Скарыны й вуліцы Варвашэні затрымалі старшыню Цэнтральнай Рады БНФ Уладзімера Кішкурну і Лявона Садоўскага. Яны ўдзельнічалі ў сустрэчы з выбаршчыкамі і былі затрыманыя за распаўсюджваньне друкаванай прадукцыі, прысьвечанай байкоту выбараў. Затрыманыя былі адвезены ў Цэнтральны РАУС.

***

27 верасьня, Валянціна Баранава, Валянціна Шэрбіна й Натальлю Емяльянаву супрацоўнікі РАУС (ахоўнікі мэтрапалітэну) затрымалі на станцыі мэтро Пляц Перамогі. Сп. Баранаў і сп. Шэрбін раздавалі ўлёткі з запрашэньнем на Марш Свабоды-3, які адбудзецца 1 кастрычніка. Сп. Емельянава трымала плякат з назвай : "Нет лукавым выборам"!

Міліцыянты Васевіч і Суднік пратрымалі іх 40 хвілінаў, пасьля чаго былі вымушаныя адпусьціць.

**Моладзь затрымліваюць**

23 верасьня паміж 21 і 22 гадзінамі вечара на вуліцы Якубава былі затрыманыя чатыры сябры Маладога Фронту (Сьвіслацкай і Кастрычніцкай Радаў). Затрыманьне адбылося ў Серабранцы каля школы № 143. Двое міліцыянтаў, пабачыўшы на школе налепкі "Усе на выбары", затрымалі і абшукалі хлопцаў. Знайшоўшы налепкі з улёткамі, маладафронтаўцаў адвезьлі ў апорны пункт міліцыі. Адтуль хлопцы былі дастаўленыя ў РУУС Ленінскага раёну, дзе знаходзіліся да 4.30 гадзін. На кожнага былі складзеныя пратаколы паводле трох артыкулаў: антысанітарыя, публічны заклік да байкоту выбараў, распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных зьвестак.

Падчас знаходжаньня хлопцаў у РУУСе супрацоўнік МУС спрабаваў адабраць у аднаго з затрыманых шалік з надпісам "Беларусь". Таксама аднаму з маладафронтаўцаў пагражалі фізычнай расправай за бел-чырвона-белую значку. Выразы пры гэтым выкарыстоўваліся ня самыя літаратурныя: "Может тебе сапогом на морду наступить?".

***

У сталіцы ўлада стала вельмі падазрона адносіцца да моладзі. 29 верасьня на праспэкце міліцыянты прыпынялі моладзь, правяралі дакументы й аглядалі асабістыя рэчы.

***

Аднаму з хлапцоў, што быў апрануты ў майку з надпісам "Марш свабоды", міліцыянт выказваў пагрозы, і нецэнзурна сказаў, каб той лепш яму не трапляўся.

***

У тралейбусе толькі з-за таго, што ў шаснаццацігадовай дзяўчыны, якая ехала разам з сваёй маці-інвалідам, на куртцы быў значак "Байкот-2000" прычапіліся міліцыянты. Дзяўчына не згаджалася аддаць значак, за што яе з маці выцягнулі з тралейбуса, каб адвесьці ў РАУС. Маці дзяўчыны не здавалася, яна пачала крычаць, прасіць дапамогі ў людзей. Міліцыянты ўсё ж такі адабралі значак, аднак былі вымушаныя адпусьціць дзяўчыну.

***

*працяг на стар. 4*



# Коней арыштавалі

***Падчас Маршу Свабоды міліцыя паводзіла сябе вельмі дзіўна***

1 кастрычніка мы былі запрошаныя для мастацкага аздабленьня "Маршу свабоды – 2000". Плянаваўся выезд наперадзе шэсьця жывой Пагоні з нашых рыцараў у дасьпехах з нацыянальнымі сьцягамі. Для гэтага мы дамовіліся пра пракат 5 коней з пагадзіннай аплатай. За паўгадзіны да пачатку акцыі нам прывезьлі коней да музэя Я. Коласа, які знаходзіцца побач з Акадэміяй Навук.



Фота Ю. Дзядзінкіна

Хутка пераапрануўшыся, хлопцы з рыцарскіх клюбаў селі на коней, але не пасьпелі яны выехаць, як былі ачэпленыя міліцыяй. "Выяжджаць не дазволена", - строга сказаў начальнік атраду: – І калі выедзеце без дазволу - коней забярэм і на вас накладзем штраф."

Кіраўнікі нашых клюбаў рызакаваць не адважыліся, аднак хлопцы з коней ня злазілі. «Нашыя продкі дасталі б нагайку ды разабраліся з хамствам», - сказаў нехта з рыцараў.

Я так і не магла разумець, у чым справа, бо дазвол на акцыю быў, і пайшла да арганізатараў маршу. Кіраўніцтва зьвярнулася да міліцэйскага палкоўніка Саланца (адказнага за акцыю), той сказаў: «Добра, хай едуць коні, але асобна, не правакуючы натоўп».

Калі я вярнулася назад да нашага атраду, то зразумела, што нас проста падманулі. Коней ня тое што на Бангалор, але і назад у стайню не адпускалі: "Чакайце загаду". А загаду ніхто не даваў да самага заканчэньня акцыі.

Тры гадзіны коні знаходзіліся пад арыштам, хоць ніякай мэтазгоднасьці ў гэтым не было. Нарэшце паступіў загад па рацыі адпусьціць, атрад міліцыі сыйшоў, хлопцы паскакалі на Бангалор даганяць "Марш", хоць і сэнсу ў гэтым было ўжо мала.

А я задаюся пытаньнем: па-першае, хто будзе плаціць за 3 гадзіны пракату, а па-другое, калі нас перастануць падманваць "паўдазволенымі" акцыямі?

**Арына ВЯЧОРКА, старшыня клюбу «Рыцары Вялікага Княства»**



vytoki.net

пачатак на стар. 3

# БАЙКОТ — 2000

2 кастрычка каля ЦУМа і на скрыжаваньні Нямігі - Машэрава праходзілі сустрэчы з выбарнікамі. Сустрэчы прайшлі спакойна, нікога не затрымалі. Але міліцыянты не давалі распаўсюджваць інфармацыю на аркушах улёткавага фармату, хаця газэты раздаваць не забаранялі.

***

Сяргея Шынкевіча, якога затрымалі яшчэ 15 верасьня, судзілі 2 кастрычніка. За арганізацыю быццам бы несанкцыянаванага пікету (на самой справе гэта была сустрэча з выбарнікамі) сп. Шынкевічу далі штраф у 150 мінімальных заробкаў.

## ЛІДА

**Перадвыбарчая кампанія па-лідзку**

26 верасьня ў Лідзе ў клюбе завода "Оптык" падчас арганізаванай уладамі сустрэчы выбарнікаў з кандыдатамі ў дэпутаты т. зв. "Палаты прадстаўнікоў" былі затрыманыя за распаўсюд агітацыйных перадвыбарчых матэрыялаў старшыня Лідзкай гарадзкой арганізацыі Маладога Фронту Артур Ганько й апазыцыйны актывіст Юрась Войцікаў.

Было канфіскавана па 60 асобнікаў газэты "Голас Ліды" №1(35) і 2(36), а таксама спэцвыпуска газэты "Рабочы".

Пікантнасьць сытуацыі заключаецца ў тым, што газэта "Голас Ліды" ўтрымлівае ня толькі інфармацыю пра акцыю "Байкот-2000", але й асьвятляе ход мясцовай перадвыбарчай кампаніі ў палатку. Так, у нумары 2(36) была надрукаваная афіцыйная праграма й біяграфічныя зьвесткі аднаго з кандыдатаў у дэпутаты - баявога лётчыка, падпалкоўніка, зямляка прэзыдэнта Аляксандра Іванкова. Так што ўлады канфіскаваўшы газэту, нанесьлі фактычны ўдар па гэтым кандыдаце, груба ўмяшаліся ў ход перадвыбарчай кампаніі.

Ні Ганько, ні Войцікаў самі нічога не распаўсюджвалі. Раздавала газэту моладзь з Маладога Фронту. А паколькі гэта моладзь, то адзін з хлапцоў без ваганьняў уручыў газэты й мэру горада, які прысутнічаў на сустрэчы. Мэр нахабства ня вынес і загадаў усіх затрымаць. Хлопцы зьніклі ў натоўпе. Тады пачалі хапаць "засьвечаных" сяброў БНФ. Так затрымалі Ганько ды Войцікава.

У пастарунку быў учынены допыт. Войцікава адпусьцілі, а на Артура Ганько склалі пратакол. Справа мусіць мецьпрацяг.

27 верасьня ў сядзібе Лідзкай гарадзкой рады ТБМ зьявілася недзе з восем міліцыянтаў "для агляду месца здарэньня". Ордэра пракурора яны ня мелі, допытаў не праводзілі, але "пераканана" задавалі пытаньні. Міліцыя шукала матэрыялы па акцыі "Байкот-2000" і высьвятляла месца друку "Голасу Ліды", а таксама паходжаньне й прыналежнасьць абсталяваньня.

Атрымаўшы тлумачэньні й копіі дакумэнтаў на абсталяваньне ды арэнду памяшканьня, міліцыя забрала адзінкавыя асобнікі матэрыялаў па "Байкоту-2000": адну ўлётку, 2-3 газэты, а таксама 3 відэакасэты з той прычыны, што ніхто з прысутных ня мог сказаць, што на тых касэтах, бо відэамагнітафона ў сядзібе няма.

***

2 кастрычніка сябру Лідзкай гарадзкой арганізацыі грамадзкага аб'яднаньня БНФ "Адраджэньне" С. Карабану прыйшоў адказ на заяўку аб правядзеньні Маршу Свабоды ў Лідзе.

У лісьце старшыня гарвыканкаму У. Малец паведамляе, што "выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прызначаны Прэзыдэнтам краіны згодна з артыкулам 84 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.У сувязі з гэтым гарадскі выканаўчы камітэт не дае дазвол на правядзенне мітынгу пад лёзунгам, вызначаным у заяве."

Дарэчы, лёзунг нічым ня "крыўдзіць" закон аб выбарах: "Не - выбарчаму фарсу!".

Але сябры БНФ вырашылі ў той жа дзень, калі плянаваўся быць "Марш Свабоды" (8 кастрычніка), правесьці сустрэчу з выбарнікамі, але ўжо несанкцыянаваную.

## ГОМЕЛЬ

**У Гомлі затрымліваюць за налепкі**

26 верасьня 2 баранавіцкія хлопцы былі затрыманыя міліцыянтамі ў Гомелі за расклейваньне налепак, якія заклікалі да байкоту выбараў.

Адзін зь іх, Мікола Агароднік, распавёў пра гэты выпадак. Ён разам са сваім сябрам Міколам Зялёнкам паехаў у Гомель па прыватных справах. У хлопцаў было некалькі ўлётак "Байкот-2000". Наляпіўшы адну зь іх на слуп, яны селі ў машыну. Праз некалькі сот мэтраў два міліцыянты машыну прыпынілі. Пасьля выявілася, што гэты ўчынак бачыў міліцыянт у цывільным, які адразу паведаміў нумар машыны й колер у свой аддзел. Па ўсім горадзе быў дадзены загад затрымаць гэтую машыну зь людзьмі.

Баранавіцкія хлопцы, ні аб чым не здагадваючыся, прыпыніліся на загад інспэктараў ДАІ. Даішнікі агледзелі салён і прапанавалі праехаць да Савецкага раённага аддзяленьня міліцыі.

Калі хлопцаў даставілі ў РАУС, адтуль выйшлі міліцыянты й пачалі рабіцьператрус у машыне. Пасьля таго, як былі знойдзены налепкі, міліцыянты пачалі пагражаць хлапцам - "Ну что, попали, теперь в Гомеле месяц бордюры белить будете и дворы подметать!" Баранавіцкіх хлапцоў пацягнулі ў пастарунак ды кінулі ў камэру з бэтону, у якой доўгі час ня вытрываюць нават жывёлы.

Толькі праз 2,5 гадзіны іх па аднаму пачалі выклікаць на допыт. Падпалкоўнік, які вёў допыт, спрабаваў вымусіць хлапцоў прызнацца ў наклейцы ўсіх улётак, якія вісяць у горадзе. Асаблівы націск рабіўся на налепку "STOP LUKA", вельмі ж хацелася міліцыянту пачаць крымінальную справу.

Пасьля допыту хлапцоў зноўку зьмясцілі ў камэру. У агульнай колькасьці баранавіцкіх хлапцоў пратрымалі больш за 5 гадзін. Пасьля хлопцы зразумелі, што іх трымалі толькі дзеля таго, каб апэратары Беларускай тэлевізіі змаглі прыехаць і зьняць іх для свайго рэпартажу, які быў у той жа дзень паказаны ў навінах. Праз 20 хвілін пасьля здымак хлапцоў адпусьцілі. Іх машыну пад канвоем суправаджалі да павароту на Рэчыцу й пасьля загадалі адзначыцца на посьце ДАІ ў Калінкавічах.

Пратаколы з Гомля перададзеныя факсам у Баранавічы.

## БАРАНАВІЧЫ

26 верасьня вечарам у Баранавічах пры расклейцы ўлётак, прысьвечаных Маршу Свабоды, затрымалі трох сяброў БНФ "Адраджэньне": Алеся Пікулу - старшыню Гарадзкой арганізацыі, Алеся Грыцаўца й Руслана Равяку - шараговых сябраў арганізацыі.

Па абедзе пад вокнамі штаб-кватэры Баранавіцкага БНФ "Адраджэньне" стала міліцэйская машына. Праз паўгадзіны пасьля пачатку наклейкі машына з выключанымі фарамі пад'ехала да фронтаўцаў. Міліцыянты з аўтаматамі абшукалі людзей і зьвязаліся па рацыі з пастарункам. Пазьней фронтаўцаў даставілі ў пастарунак, дзе з Руслана Равякі была ўзята тлумачальная цыдулка, а таксама былі перапісаныя прозьвішчы астатніх. Мабыць тое, што Марш Свабоды быў усё ж такі дазволены Менскім гарвыканкамам, адыграла

сваю ролю: праз паўгадзіны пасьля затрыманьня міліцыянты ўлёткі вярнулі ды вызвалілі саміх затрыманых.

### МАЛАДЭЧНА

У сераду 27 верасьня, выбарчая камісія горада Маладэчна рабіла спробу наладзіць сустрэчу выбарнікаў з кандыдатамі ў палатку. Сустрэча мела адбыцца на прадпрыемстве "Маладэчнамэбля" увечары, пасьля зьмены.

Прыйшло 4 кандыдаты: сп.Раманоўскі, сп. Гурал, сп. Гаварушкін, сп. Зубрыцкі, іх дзьве давераныя асобы і давераная асоба А. Гайдукевіча (ЛДП).



У залю на 500 асобаў прыйшло 13 чалавек (разам з дырэктарам і адміністрацыяй).

Выходзячы з фактаў, можна сказаць, што сустрэча з выбарнікамі правалілася.

Дарэчы, "Маладэчнамэбля" - прадпрыемства, якое нядаўна квітнела, зараз знаходзіцца ў складанай эканамічнай сытуацыі. За апошнія 2 гады скарацілі 400 чалавек, на гэтым працэс скарачэньн спыняцца не зьбіраецца.

### КЛЕЦАК

29 верасьня пры распаўсюджваньні спэцвыпуску газэты "Рабочы" каля прахадной Клецкага мэханічнага завода пад'ехала машына міліцыянтаў. Супрацрўнікі РАУС затрымалі старшыню гарадзкой рады БНФ Яўгена Тураўца і завезьлі яго ў адзьдзяленьне міліцыі.

Там, як паведамляе сам затрыманы, міліцыянты доўга шукалі артыкул, па якім яго можна затрымаць.У выніку ў Яўгена Тураўца ўзялі расьпіску і канфіскавалі газэту (400 асобнікаў).

### РЭЧЫЦА

У сераду Настасься Мароз, сямнаццацігадовая дзяўчына, пайшла разам са сваёй сяброўкай у пашпартны стол, дзе наклеіла налепку «Байкот – 2000». Супрацоўнікі, якія гэта ўбачылі, адразу ж патэлефанавалі ў мясцовы РАУС. Дзяўчынку затрымалі, завезьлі ў аддзяленьне міліцыі. Там канфіскавалі налепкі, склалі 2 пратаколы. Першы – за тое, што яна распаўсюджвала агітацыю ў непрызначаным месцы (наклеіла дзяўчына на нейкі плякат); другі – за тое, што улёткі былі без выходных зьвестак.

Дзяўчынка непаўналетняя, таму суда не было, але пагражалі, што могуць даць штраф у памеры 6 мінімальных заробкаў.

Затым Настасься Мароз была змушана пусьціць міліцыянтаў да сябе дамоў, там яна аддала 3 налепкі, якія ў яе былі.

Сьледчы Кандрацьеў праводзіў «выхаваўчую працу» з дзяўчынай, пытаўся, колькі ёй плоцяць за распаўсюджваньне налепак. А затым даводзіў, што АБСЭ - банда, якая замінае добраму жыцьцю.

### ГОРАДНЯ

2 кастрычніка ў 1 ночы на асабістай машыне быў затрыманы адзін зь лідэраў гарадзенскага БНФ Сяржук Паўленка. У машыне зрабілі вобыск і знайшлі 16000 асобнкаў улётак, прысьвечаных байкатаваньню выбараў.

Сп. Паўленку завезьлі ў Кастрычніцкі РАУС г. Горадні. Там канфіскавалі ўвесь наклад улётак і склалі пратакол. Затрыманага адпусьцілі, але ўжо ў 6 гадзінаў раніцы выраšылі "наведаць" дома. Міліцыянты зьявіліся з позвай у Кастрычніцкі РАУС.

Сяржук Паўленка зьвярнуўся ў праваабарончы цэнтар "Вясна" і толькі пасьля кансультацыі пайшоў да намесьніка начальніка Кастрычніцкага РАУСу сп. Сідара. У затрыманага патрабавалі інфармацыю: адкуль улёткі ды каму яны прызначаліся. Сп. Паўленка адмовіўся даваць паказаньні без прадстаўнікоў праваабарончага цэнтру і адваката; ніякіх папераў не падпісваў.

***

1 кастрычніка за расклейваньне налепак былі затрыманыя два маладафронтаўцы. Але пасьля таго, як зь імі правялі "выхаваўчую работу", адпусьцілі.

### ВІЦЕБСК

У дзень "Маршу Свабоды", 1 кастрычніка, на чыгучным вакзале горада Воршы быў затрыманы старшыня Цэнтру маладзёвых ініцыятыў "Контур" Юры Корбан.

Сп. Корбан ехаў на акцыю аб'яднанай апазыцыі "Марш Свабоды". На прыпынку ў Воршы ён выйшаў і наклеіў на інфармацыйным стэндзе ўлётку "Байкот - 2000". У той жа момант да яго падышлі два чалавекі ў цывільным і павялі ў пастарунак. Там склалі пратакол, які аднак сп. Корбан не падпісаў. У аддзяленьні міліцыі Юрыя Корбана трымалі, пакуль ягоны цягнік не пайшоў на Менск. Сп. Корбану прыйшлося вярнуцца ў Віцебск, не трапіўшы на "Марш Свабоды".

### ПОЛАЦАК

У Полацку затрымалі Сяргея Кухарэнку, практычна схапілі, бо некаму зь міліцыянтаў падалося, што ён расклейваў налепкі. У пастарунку яго пратрымалі 5 гадзін (пры максымальна дазволеных трох ), без прад"яўленьня абвінавачваньня.

У аддзяленьні міліцыі сп. Кухарэнку абшукалі, але нічога не знайшлі: ні налепак, ні ўлётак. Затым Сяргея Кухарэнку пыталіся, дзе ён жыў, з кім сустракаўся, відавочна, жадаючы за нешта "зачапіцца". Пасьля чаго быў складзены пратакол, дзе гаварылася, што, паводле сьведак, Сяргей Кухарэнка расклейваў у горадзе налепкі. Аднак на пытаньне сп. Кухарэнкі "Якіх сьведак?", яны нічога не адказалі.

**Прэсавая група БНФ "Адраджэньне" й Партыі БНФ**

vytoki.net

## Разьвіцьцё парлямэнтарызму ў Беларусі

*29 верасьня ў Вільні прайшла канфэрэнцыя пад назвай "Разьвіцьцё парлямэнтарызму ў Рэспубліцы Беларусь". Канфэрэнцыя была арганізаваная групай для сувязяў зь Вярхоўным Саветам 13 - га Скліканьня Сэйму Летувы, Вярхоўным Саветам 13 Скліканьня Беларусі, Міжнароднай асацыяцыі парлямэнцкай салідарнасьці ў падтрымку дэмакратыі ў Беларусі ды Фундацыяй падтрымкі грамадзянскай абароны.*

У канфэрэнцыі прымалі ўдзел сябры летувіскага Сэйму Л. Андрыкене (старшыня прэзыдыюму Балтыйскай Асамблеі), Э. Зінгерыс (старшыня камітэту па правох чалавека), намесьнік амбасадара ЗША ў Беларусі Д. Кунстадтэр, і беларускія палітыкі В. Вячорка, С. Шушкевіч, З. Пазьняк, А. Лябедзька, Р. Пракаповіч, М. Пастухоў.

Быў запрошаны на гэтую канфэрэнцыю і амбасадар Беларусі ў Летуве В. Гаркун. Але ён адмовіўся удзельнічаць, патлумачыўшы тым, што ў запрэшэньні йшла размова аб нелегітымнасьці выбараў 15 кастрычніка ў Беларусі.

Напрыканцы канфэрэнцыі была прынята заява:

Мы, ўдзельнікі канфэрэнцыі "Па праблемах парлямэнтарызму ў Рэспубліцы Беларусь" у Сэйме Летувы,

Выходзячы з нашай агульнай трывогі за лёс Беларусі,

Бачачы асноўную пагрозу незалежнасьці й дэмакратычнай пэрспэктыве Беларусі ў падтрымцы Расеяй антыдэмакратычнага рэжыму А. Лукашэнкі,

Прызнаючы Вярхоўны Савет адзіным легітымным парлямэнтам краіны,

Засноўваючыся на Санкт-Пецярбурскай і Бухарэсцкай рэзалюцыях ПА АБСЭ і на рашэньнях Стамбульскага саміту АБСЭ, якія патрабуюць ад уладаў Беларусі выканаць умовы дэмакратычных выбараў,

Канстатуючы невыкананьне згаданых умоваў,

Заяўляем:

– Аб падтрымцы патрабаваньняў дэмакратычных сілаў Беларусі да міжнароднай супольнасьці не прызнаваць выбараў у г. зв. Палату прадстаўнікоў справядлівымі, а таксама не прызнаваць сфармараваны праз іх орган,

– Аб немагчымасьці міжнароднага прызнаньня сыстэмы дагавораў аб саюзе Беларусі й Расеі і аб утварэньні саюзнай дзяржавы, як падпісаных ва ўмовах адсутнасьці дэмакратычнага волевыяўленьня народа Беларусі,

– Аб падтрымцы барацьбы беларускай апазыцыі за дэмакратыю й незалежнасьць сваёй краіны.

Заяву падпісалі С. Шарэцкі, А. Лябедзька, С. Шушкевіч, З. Пазьняк, В. Вячорка, С. Печалюнас.

**Эдвард БАРОК**



# Нямеччына праз дзесяць гадоў

Увесну 1990 году, калі ўжо Мур, які СССР называў "абаронным валам сьвету", быў разбураны, але афіцыйнае аб'яднаньне яшчэ не адбылося, здавалася, што жыцьцё ў былой ГДР замерла. Дрэздэн, дзе сёньня адбываюцца ўрачыстасьці, прысьвечаныя дзясятай гадавіне "паварoту" (так яшчэ ў Нямеччыне называюць аб'яднаньне), выглядае шэрым і сумным. Ня менш прыгнятальнае ўражаньне наводзіў і яго вечны супернік за першанства ў Саксоніі Ляйпцыг.



*Апоўначы ў Германіі пачалося сьвята*

На вуліцы Бэрліну, якому яшчэ толькі належала зноў стаць сталіцай адзінай Нямеччыны, нечакана высыпалі незьлічоныя віетнамцы, што гандлююць кантрабанднымі цыгарэтамі, а каля Брандэнбурскіх брамаў разьвярнуўся кірмаш, на якім можна было набыць савецкія вайсковыя вушанкі, баваўняную і іншую вайсковую маёмасьць.

Заходняя група савецкіх войскаў стала рыхтавацца да вываду, і на перадзе яшчэ былі скандалы з распродажам армейскай маёмасьці, не апошнюю ролю ў якіх гісторыя адвяла апошняму камандуючаму групай войск.

Прайшло некалькі гадоў. Новыя ўлады пранумаравалі ў Дрэздэне камяні, зь якіх была пабудаваная галоўная царква горада Марыен кірхэ. Дамы ў Ляйпцыгу, адкуль пайшла хваля пратэстаў супраць Сацыялістычнай адзінай партыі Нямеччыны, вызваліліся ад копаці, што насълаілася за некалькі дзесяцігодзьдзяў, а ўся ўсходняя, ня так даўно сацыялістычная, частка краіны ўпрыгожылася незьлічонымі тэлевізійнымі талеркамі.



У былой ГДР прайшло паляваньне на ведзьмаў. Хтосьці з былых лідараў апынуўся ў выгнаньні, хтосьці на лаўцы падсудных, а потым за кратамі. Знакаміты спэцназ міністэрства ўнутраных справаў ГСГ - 9 панёс страты ў дробнай антытэрарыстычнай апэрацыі ў маленькім усходненямецкім мястэчку.

Прыкладна тады ж грамадзяне былой ГДР, зараз бундэзбюргэры, адвярнуліся ад прадуктаў з Захаду і зноў сталі набываць мясцовае піва, кілбасы і малочныя прадукты, якія, як яны высьветлілі для сябе, смачнейшыя.

Сьведкі распавядаюць, што калі Міхаіл Гарбачоў аб'явіў Гельмуту Колю, што Савецкі Саюз гатовы згадзіцца на аб'яднаньне Нямеччыны, канцлер амаль не страціў дар мовы. Ён рыхтаваўся да доўгага гандлю і думаў, што за паварот прыйдзецца нятанна заплаціць. Нямеччына потым заплаціла - гуманітарнай дапамогай зьбяднелай Расеі. Сяброўства з Гельмутам працягнуў Барыс Ельцын, чый дырыжорскі дэбют у Бэрліне ўразіў публіку ня менш, чым выступ Герберта фон Караяна.

Сёньня на ўрачыстасьцях у Дрэздэне ня будзе ні Коля, ні Гарбачова. Але нямецкае пытаньне, якім яно заставалася з 1945 па 1990 год, вырашана пры іх непасрэдным удзеле.

**Паводле радыё ВВС**

# Узьдзеяньне з мэтай атрыманьня згоды, ці Як уплываць на выбарніка

***Нам трэба вучыцца пераконваць людзей. і пад час цяперашняй кампаніі байкоту, і пад час прэзыдэнцкіх выбараў такія веды будуць неабходныя актывістам фронту. У гэтым артыкуле вы можаце пазнаёміцца з тым, як можна эфэктыўна ўплываць на думку чалавека.***

Напружаны рытм сучаснага жыцьця часам не дазваляе нам прыняць цалкам абдуманыя рашэньні нават у важных пытаньнях. Калі–нікалі пытаньні бываюць складанымі, час – абмежаваным, эмацыйнае ўзбуджэньне – моцным, а разумовая напруга – высокай. У такіх абставінах мы вымушаныя дзейнічаць стэрэатыпна, аўтаматычна. У такіх умовах спрацоўвае прынцып пасьлядоўнасьці.

Ён выклікае ў людзей аўтаматычную рэакцыю згоды.

Гэты прынцып узьдзеяньня неабходна ведаць людзям, якія займаюцца выбарнымі тэхналёгіямі, бо галасаваньне за кандыдата – гэта часьцей за ўсё выклік каманды "так" на аўтаматычным узроўні. Як зрабіць так, каб за вашага кандыдата большасьць электарату сказала "так"?

Робэрт Чалдзіні ў сваёй кнізе "Псыхалёгія ўплыву" прыводзіць цікавае апісаньне паводзінаў людзей на іпадроме. За дваццаць сэкундаў да таго, як зрабіць стаўку, людзі адчуваюць сябе няўпэўнена. Але праз трыццаць сэкундаў пасьля таго, як стаўкі былі зробленыя, гэтыя людзі настройваюцца больш аптымістычна. Калі прымаецца рашэньне й вызначаецца пэўная пазыцыя, людзі становяцца схільнымі да пасьлядоўнасьці ў сваіх дзеяньнях. Яны нібыта ўпэўніваюць сябе, што зрабілі правільны выбар.

Такім чынам, у выбарнай кампаніі вельмі важна ўнесьці папярэдняе заключэньне абавязальніцтваў (партыйныя білеты, удзел у сьпісах, заключэньне дамоваў, выдача сэртэфікатаў - што заўгодна) дзеля спрацоўваньня прынцыпу пасьлядоўнасьці. І чым раней гэта будзе праведзена з электаратам, тым цяжэй будзе канкуруючаму боку пераўпэўніць вашых пасьлядоўнікаў. На іншага каня можна ставіць, калі грошы яшчэ ня ўнесеныя. Калі стаўкі зробленыя, то перадумаць нашмат цяжэй.

Чаму прынцып пасьлядоўнасьці спрацоўвае?

Пасьлядоўнасьць асацыюецца з інтэлектуальнасьцю, сілаю, лёгікай, рацыянальнасьцю, стабільнасьцю. Ці ня гэтых якасьцяў так не хапае нашаму грамадзтву ў апошні час? Пасьлядоўнасьць як рыса характару цэніцца ў грамадзтве вельмі высока. Чалавека, чые перакананьні й словы разыходзяцца са справай, звычайна прызнаюць ненадзейным. Прыкладам могуць служыць словы , якія часьцяком можна пачуць ад нядаўніх прыхільнікаў ППРБ:"Я на яго паглядзеў, несур'ёзны ён чалавек!"

Зь іншага боку, менавіта дзякуючы прынцыпу пасьлядоўнасьці, шмат кандыдатаў застаецца на другі тэрмін. Народ выбірае паводле прынцыпу " Хай ён і дрэнны, але да гэтага мы ўжо прызвычаіліся. Хай ён штосьці ня так робіць, але невядома, што будзе рабіць іншы".

Як жа трэба працаваць нашым агітатарам, каб данесьці сваю думку!

Новаму заўсёды больш складана. Новае менш прадказальнае, а значыць і менш пасьлядоўнае ва ўяўленьні выбарніка. А ён, у асноўным, сталага ўзросту. Менавіта ён па звычцы, выпрацаванай яшчэ ў часы сацыялізму, паслухмяна прыйдзе галасаваць нават у пэрыяд пасеву ці збору ўраджаю на сваім лецішчы. Зыходзячы з гэтых ягоных асаблівасьцяў, галасаваць ён будзе за ўжо вядомага кандыдата, альбо за таго, у сьпісах якога ён паставіў сваю галачку. Дакумэнт для яго – папера важная, ён перад ёй ужо нясе абавязальніцтвы.

Як дасягнуць прыняцьця чалавекам прынцыпу пасьлядоўнасьці датычна вашай пазыцыі ў выбарах? З дапамогай сыстэмы абавязальніцтваў. Невялікая дапамога выбарнікаў кандыдату зможа запусьціць мэханізм абавязальніцтваў у адносінах да яго. Калі вы прапануеце падпісацца пад нязначным зваротам вашага кандыдата (перанесьці нязручны прыпынак транспарту ), то гэтыя людзі з большай верагоднасьцю стануць трымацца ўжо вызначанай імі пазыцыі.

Пісьмовыя абавязальніцтвы эфэктыўныя зь некалькіх прычынаў. Людзі адносяцца да іх больш адказна - яны могуць быць агучаныя. На пісьмовыя абавязальніцтвы патрабуецца больш намаганьняў. Людзі схільныя лічыць, што падпісаныя паперы адлюстроўваюць іхныя сапраўдныя думкі і падсьвядома імкнуцца прывесьці свае ўяўленьне пра сябе ў адпаведнасьць са сваёй пісьмовай заявай.

Але пры гэтым трэба ўлічваць адну вельмі важную рэч - мы прымаем на сябе ўнутраную адказнасьць за выбраную форму паводзінаў, калі думаем, што аддалі перавагу ёй пры адсутнасьці вонкавага ціску. Памятайце, што як няўмелая прапаганда (навязваньне сваёй думкі), так і ўзнагарода могуць успрымацца, як формы ціску. Такім чынам, больш дзейсным будзе мэтад дабрахвотнага абавязальніцтва, няхай дробнага і нязначнага.




Абавязальніцтвы, якія цягнуць за сабою ўнутраныя зьмены чалавека, найбольш выйгрышная форма ўплыву на выбаршчыка. Людзі, якія прымаюць такія абавязальніцтвы, будуць схільныя прытрымлівацца іх у розных абставінах. Больш за тое, гэтыя людзі пачнуць аўтаматычна па-іншаму глядзець на многія рэчы. Яны будуць упэўніваць сябе, што выбралі правільны шлях. Яны пачнуць зьвяртаць увагу на тое, чаго раней не заўважалі. Яны стануць дасягальнымі для аргумэнтаў, якія ігнаравалі раней.

**Паводле матэрыялаў кнігі Робэрта Чалдзіні "Псыхалёгія ўплыву" падрыхтавала Тамара ПЯТРОВА**



vytoki.net

## НЕСАНКЦЫЯНАВАНЫ СХОД ТАКСІСТАЎ

***У Берасьці прайшоўнесанкцыянаваны сход кіроўцаў маршрутных таксовак.***

Адно з галоўных пытаньняў, што падымалася, - узаемадзеяньне зь дзяржаўнымі органамі і нязгода з шэрагам патрабаваньняў, якія яны прад'яўляюць. На сход кіроўцы запрасілі прадстаўнікоў улады і журналістаў мясцовых СМІ.

## У МАГІЛЁВЕ АБВАСТРАЕЦЦА ТРАНСПАРТНАЯ ПРАБЛЕМА

***Старшыня Магілёўскага аблвыканкаму Міхаіл Дражын прапанаваў, каб прадпрыемствы дастаўлялі людзей на працу на ўласным аўтатранспарце.***

Гэта зьвязана з катастрафічным станам, у якім апынуўся магілёўскі аўтапарк. Праўда, падобная прапанова выглядае даволі ўтапічна, паколькі далёка не ва ўсіх ёсць падобныя магчымасьці, нават у такіх гігантаў, як "Хімвалакно", няма столькі транспарту, каб перавозіць тысячы людзей. З транспартнага падатку дзяржава здолела набыць толькі два аўтобусы ды адрамантаваць два дзясяткі машынаў. Напэўна, варта чакаць, што ў хуткім часе транспартная праблема яшчэ больш абвострыцца.

**BARC**



## АЛЯКСАНДАР СТРАЛЬЦОЎ-КАРВАЦКІ

*Сябра Сойму БНФ, сакратар міжнароднай камісіі*



*Аляксандар Стральцоў-Карвацкі нарадзіўся ў Менску, 27 сьнежня 1970 г.*

*У 1988 г. закончыў сярэднюю школу № 140 г.Менск*

*З 1988 па 1993 гг. вучыўся ў Беларускай Політэхнічнай Акадэміі, закончыў з кваліфікацыяй інжынэр-электрамэханік;*

*У 1995 г. удзельнічаў у праграме павышэньня кваліфікацыі ў эканоміцы для тэхнічных і адміністрацыйных кадраў, па праграме Carl Duisberg Gesellschaft e.V. (Кёльн, Нямеччына);*

*З 1996 па 1999 гг. - вучыўся ў аспірантуры НД Інстытута Эканомікі пры Мінэканомікі РБ*

*Грамадзкая актыўнасьць:*

*1993-1996 гг. Віцэ-старшыня "Маладзёвай Фракцыі БНФ" (зараз - "Малады Фронт");*

*з 1995 г. старшыня Асьветніцкага Маладзёвага Цэнтру "Адукатар" (Менск);*

*з 1997 г. сябра Рады Цэнтру Супольнасьць (Менск);*

*з 1999 г. сябра Сойму БНФ "Адраджэньне"*

*з 1999 г. сакратар камісіі па замежных справах Беларускага Народнага Фронту;*

*Веравызнаньне: каталік рымскага абраду*

Сваю заяву на ўступленьне ў Партыю БНФ Вы можаце дасылаць на адрас:

**220005, г. Менск, вул. Варвашэні, 8,**

**Управа Сойму Партыі БНФ**

**Ва Ўправу Сойму Партыі БНФ Грамадзяніна Беларусі**

______________________________
(прозьвішча)

______________________________
(імя)

______________________________
(імя па бацьку)

**які нарадзіўся «___» ______________ 19__ г**

**жыве па адрасе:** ____________________
(індэкс і поўны адрас)

______________________________

**род заняткаў:** ____________________

**тэл.** ____________________

Modern History Archives
Archiv Nejnovějších Historii
Fond 1112 sprava H15

**ЗАЯВА**

**Прашу прыняць мяне ў Партыю БНФ. Праграмныя палажэньні БНФ «Адраджэньне» падзяляю. Абавязуюся выконваць Статут Партыі БНФ.**

__________ (дата) __________ (подпіс)

НавіНЫ
БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ "АДРАДЖЭНЬНЕ"
№ 10 (27), кастрычнік 2000 г, наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна на правах нумараной

У нумары скарыстаная выява Пагоні з тытульнага аркуша Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г.
Адрас для паставаньня: 220006, Менск, а/с 27, тэл. 284-50-12
E-mail: bnf@journalist.com
в.а. рэдактара Віктар Івашкевіч

У нумары выкарыстаныя фатаздымкі Irex/ProMedia

vytoki.net